СНЕЖАНЬСКІЯ ЗАМАЛЁЎКІ



ПА ГАРЫЗАНТАЛІ: **1.** Снежань — не брат, а холад — не ... *(прык.)*. **5.** «Так высыпаў ззябна, бязрадасна снег // У першы папас свой, у першы ...». З верша Я. Купалы «Першы снег». **8.** Аснова чаго-небудзь *(перан.)*. **10.** Месца на судне. **12.** Адбіццё нападу. **14.** «У снезе белую рабіну // Апанавалі ...». З верша С. Грахоўскага «Палаюць гронкі, як рубіны». **15.** «Снег як ... . Як прасціна. // Зорак свежая ралля». З верша Н. Аксёнчык «Выпаў снег». **17.** Коннік, верхавы. **18.** Зіма, як ..., сваё возьме *(прык.)*. **19.** Сінічкі з раніцы пішчаць — будзе ... *(прыкм.)*. **20.** У снежні ... на лета, зіма на мароз паварочваюць *(прык.)*. **21.** Парны танец. Міжнародны дзень ... адзначаецца штогод 11 снежня. **23.** Калі снежань будзе халодны, з вятрамі і завірухамі, то летам будзе добры ... *(прыкм.)*. **27.** Музычна-драматычны твор. **29.** Буйная рака на Алясцы і ў Канадзе, даўжыня якой 3700 км. **30.** На Ганкі сядайце на ... *(прык.)*; прысвятак Ганна адзначалі 22 снежня. **31.** Зімовы ... . Прысвятак, які адзначалі 19 снежня («Да ... няма зімы ніколі» *(прык.)*. **32.** «... не вее, сціхнуў вецер, // І волен лёгкіх санак бег». З верша М. Багдановіча «Зімой».

ПА ВЕРТЫКАЛІ: **2.** У снежні ... пагод на дварэ: сее, вее, дуе, кружыць, рве і мяце *(прык.)*. **3.** У казахаў і кыргызаў народны паэт-пясняр. **4.** ... на зямлі, што гной для ўраджаю *(прык.)*. **5.** Вокіс натрыю. **6.** На ... загрымела — будзе холад *(прык.)*. **7.** Тое, што і штабель. **9.** Лоўкі прыём. **11.** Прысвятак, які адзначалі 4 снежня («... прыйшло, зіму прынясло» *(прык.)*). **13.** Рэч, якую дораць. Дзень ... у шэрагу краін адзначаюць 26 снежня. **16.** Балотная трава з доўгім, вузкім лісцем. **17.** Нанесеная ветрам гурба снегу. **20.** Пасля сонцавароту (22 снежня) хоць на вераб'іны ... прыбудзе дня *(прык.)*. **22.** ... ў снежня сіла — шмат святаў, ды маразы засілле бяруць *(прык.)*. **24.** Вузкая паласа, лінія. **25.** Буйны салодкі плод бахчавай расліны. **26.** Мужчынскае імя. **28.** У тэлефоннай размове вокліч: «Слухаю!». **29.** Зімовы ... . Прысвятак, які адзначалі 9 снежня; лічылася, што на ... зіма збіраецца ў поўную сілу.

Склаў Лявон ЦЕЛЕШ,
г. Дзяржынск.

Правяраем, калі ласка, адказы:
Па гарызанталі: 1. Сястра. 5. Начлег. 8. Кавба. 10. Тум. 12. Адпор. 14. Снегіры. 15. Свята. 17. Сядок. 18. Казна. 19. Мароз. 20. Сонца. 21. Танга. 23. Ураджай. 27. Опера. 29. Юкон. 30. Санкі. 31. Мікола. 32. Мацёрь.
Па вертыкалі: 2. Сем. 3. Акын. 4. Снег. 5. Натр. 6. Ліёд. 7. Стос. 9. Трук. 11. Вядзенне. 13. Падарунак. 16. Асака. 17. Сумёт. 20. Скок. 22. Адна. 24. Рыса. 25. Дыня. 26. Аким. 28. Ало. 29. Юр'е.

СЁННЯ

Месяц

Маладзік 7 снежня.
Месяц у сузор'і Казярога.

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	9.14	16.48	7.34
Віцебск —	9.11	16.30	7.19
Магілёў —	9.04	16.38	7.34
Гомель —	8.53	16.43	7.50
Гродна —	9.28	17.05	7.37
Брэст —	9.21	17.14	7.53

Імяніны

Пр. *Аляксандра, Васіля, Кузьмы, Паўла, Пятра, Рыгора, Сямёна.*
К. *БЕЗЗАГАННАГА ЗАЧАЦЦЯ НАЙСВЯЦЕЙШАЙ ПАННЫ МАРЫІ. Лаўрэнція*

Фота Ліны МАЛІНІНАЙ.

ЗАЎТРА



Каза з'ела 20 000 еўра

У сербскім сяле Ранілавіч, што за 80 кіламетраў ад Бялграда, свойская каза зжавала 20 тысяч еўра наяўнымі, паведамляе РІА Навіны.

Мілена Сіміч і яе муж падрыхтавалі грошы, каб купіць дзесяць гектараў зямлі. Каза па мянушцы Вавёрка, якая жыла ў іх некалькі гадоў, прабралася ў дом праз незачыненыя дзверы і знайшла купюры на стале. «Калі мы пачулі шамаценне і шум, муж пайшоў паглядзець, што адбываецца, і тут яго ледзь удар не хапіў. Вавёрка з'ела ўсе грошы са стала, засталося толькі каля 300 еўра, усё астатняе зжавана і праглынута», — расказала жанчына. Паводле яе слоў, з тых часоў муж толькі моўчкі сядзіць і глядзіць у адну кропку. Каза, якая з'ела грошы. Жывёла паплацілася за сваю пражэрлівасць: яе прыгатавалі на ражне.

Даты | Падзеі | Людзі

8 СНЕЖНЯ

1612 год — быў пасвячоны ў рыцары Мальтыйскага ордэна Жыгімонт Кароль Радзівіл, які стаў першым камандорам у ВКЛ.

1918 год — нарадзіўся (в. Хатляны Уздзенскага раёна) Аляксандр Сямёнавіч Махнач, вучоны-геолаг, член-карэспандэнт, акадэмік НАН Беларусі, доктар геолага-мінералагічных навук, прафесар, заслужаны дзеяч навук Беларусі. Удзельнічаў у пошуку і адкрыццях радовішчаў калійнай і каменнай соляў у Беларусі. Аўтар больш як 400 навуковых прац. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі. Памёр у 2006 годзе.

1943 год — нарадзіўся (Расія) Віктар Аляксеевіч Данілаў, беларускі вучоны ў галіне машынабудавання, доктар тэхнічных навук, вынаходнік СССР. Аўтар навуковых прац па тэхналогіі і абсталяванні для механічнай апрацоўкі і кантролю складаных паверхняў дэталяў машын. Распрацаваў і ўкараніў у вытворчасць прагрэсіўныя тэхналогіі, металарэжучыя станкі і прылады для апрацоўкі складаных паверхняў.

1802 год — нарадзіўся Аляксандр Адоеўскі, князь, рускі паэт, дзекабрыст. Аўтар элегій, гістарычных паэм.

1904 год — нарадзіўся Пётр Кірылавіч Кашавой, Маршал Савецкага Саюза, двойчы Герой Савецкага Саюза. У 1939-м скончыў Ваенную акадэмію імя Фрунзэ. З 1920 года ў Чырвонай Арміі. У гады Вялікай Айчыннай вайны з 1941 года на Волхаўскім, Сталінградскім, Паўднёвым, 4-м Украінскім, 3-м Беларускім франтах: камандзір стралковай дывізіі, корпуса; удзельнік вызвалення Данбаса, Крыма, Беларусі (Віцебска, Оршы, Барысава, Мінска), Усходне-Прускай аперацыі. У 1945—1957 гадах — першы намеснік галоўнакамандуючага, у 1965—1969 гадах галоўнакамандуючы Групы савецкіх войскаў у Германіі. Памёр у 1976 годзе.



1933 год — нарадзіўся Леў Іванавіч Барысаў, расійскі акцёр тэатра і кіно, народны артыст Расійскай Федэрацыі. Здымаўся ў фільмах «Вышыня», «Вуліца маладосці», «Дзямідавы» ды іншых. Памёр у 2011 годзе.

1987 год — у Вашынгтоне генеральны сакратар ЦК КПСС Міхаіл Гарбачоў і прэзідэнт ЗША Рональд Рэйган падпісалі Дагавор аб ліквідацыі ракет сярэдняй і меншай далёкасці — першае пагадненне, якое прадугледжвала абсалютнае скарачэнне ўзбраеньняў. Знішчэнню падлягалі 2611 ракет. Дагавор уступіў у сілу 1 чэрвеня 1988 года. Удзельнікі пагаднення абавязаліся не вырабляць, не выпрабоўваць і не разгортваць балістычныя і крылатыя ракеты наземнага базіравання сярэдняй (ад 1000 да 5500 км) і малой (ад 500 да 1000 км) далёкасці.

УСМІХНЕМСЯ

Рэкламная аб'ява:
— Нашы спецыялісты могуць паправіць нават тое, што адрамантаваў ваш муж!

Не хадзіў па пакупкі з лістком — не мужык!

— У дзяцінстве бацькі мяне зацікавілі археалогіяй, і я палюбіў гэты занятак. Уяўляў сябе сапраўдным археолагам. Але аднойчы да мяне падышоў сусед і сказаў, што на самай справе гэта называецца «капаць бульбу»!

Правіла выжывання для дажджлівых дзён: прамачыў ногі — прамачы горла.

— Я, між іншым, маці семярых дзяцей, і мой муж кажа...
— А, вы яшчэ і пагаварыць паспяваеце?..

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 4524. Нумар падпісаны ў 19.30 7 снежня 2018 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12